**277.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары. Вызначце, да якога разраду адносяцца прыметнікі.

1. Расчасалі[сл] вішні шо..кавыя косы і ўранілі долу сн..гавы в..нок *(П. Трус)*. 2. І над вёскаю далёка чу..цца бусліны клёкат *(Г. Аўласенка)*. 3. Малюе мастачка зіма крыштальныя кветкі на шкле і дзівіцца з шыбы сама пры ц..мяным, х..лодным святле *(М. Курыла)*. 4. Наварысты курыны булён яшчэ ў XII стагод..зі лічы..ся лекамі супраць грып.. і пр..студы *(З газеты «Звязда»)*. 5. Так пяе птушыны хор, аж зв..ніць зарэчны бор! *(А. Русак)*.

Якое слова мае значэнне 'з густым наварам'?

**булён**

## § 45. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне і ўжыванне

**278.** Прачытайце тэкст. На колькі сэнсавых частак яго можна падзяліць?

### Чаму снег рыпіць пад нагамі?

Снег складаецца з **найдрабнейшых** часцінак замёрзлай вады. Рыпенне снегу — гэта ўсяго толькі шум ад расціснутых крышталікаў. Рыпіць снег[м] толькі ў мароз. Чым **мацнейшы** мароз, тым **вышэйшая** танальнасць* рыпення. Узмацненне маразоў робіць ледзяныя крышталікі **больш цвёрдымі** і крохкімі.

Калі на двар.. мароз, то ты не змож..ш скачаць снежны к..мяк, таму што снег занадта ра..сыпісты. Вельмі мокры снег таксама не пад..дзе, бо снежная баба стане падобнай да апаленай свечкі *(Паводле А. Чайкі)*.

**крышта́лік**

Запішыце выдзеленыя словы ў пачатковай форме паводле ўзору.

Узор. *Найсвятлейшы — светлы, дужэйшы — дужы, больш мяккі — мяккі.*

Спішыце апошні абзац, устаўляючы прапушчаныя літары.

**!** Якасныя прыметнікі могуць мець вышэйшую і найвышэйшую ступені параўнання.

**Вышэйшая ступень параўнання** прыметнікаў паказвае, што ў адным прадмеце якасці больш ці менш у параўнанні

з іншым прадметам: *вясёлы — весялейшы за сябра, малады — больш малады, чым бацька.* Вышэйшая ступень параўнання паказвае і на большае ці меншае праяўленне прыметы ў аднаго прадмета, асобы, жывёлы, з'явы: *дзядуля стаў мудрэйшым, калідор зрабілі шырэйшым, ён быў менш вясёлы.*

**Найвышэйшая ступень параўнання** прыметнікаў абазначае самую высокую або самую нізкую ступень якасці: *моцны — наймацнейшы* або *самы моцны, дрэнны — найгоршы* або *самы дрэнны.*

Пры формах вышэйшай ступені параўнання могуць ужывацца словы ***куды, яшчэ***: *куды лепшы, яшчэ горшы.*

**279.** Прачытайце. Запішыце ў асобныя групы сказы з прыметнікамі ў форме вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання.

1. Як сонца, матуля найлепшая ў свеце *(У. Мазго).* 2. Вецер уверсе быў мацнейшы, чым на зямлі *(Я. Сіпакоў).* 3. Маміна імя — самае лепшае, маміна слова — найдаражэйшае *(М. Хведаровіч).* 4. Камета Галея[ф] значна больш актыўная за іншыя каметы *(А. Чайка).* 5. Прыпяцкія балоты лічацца самымі вялікімі ў Еўропе *(Г. Аўласенка).*

Растлумачце, што абазначаюць прыметнікі ў формах вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання.

!

Вышэйшая ступень параўнання прыметнікаў мае простую *(прыгажэйшы)* і складаную *(менш прыгожы)* формы.

**Простая форма вышэйшай ступені параўнання** прыметнікаў утвараецца ад пачатковай формы якасных прыметнікаў пры дапамозе суфіксаў ***-ейш-(-эйш-)***: *цікавы — цікавейшы, высокі — вышэйшы* ці пры дапамозе іншых асноў: *добры — лепшы, дрэнны — горшы, вялікі — большы, малы — меншы.*

Простая форма вышэйшай ступені параўнання ўжываецца ў канструкцыях «прыметнік + ***за*** + В. скл.», «прыметнік + + ***чым*** + Н. скл.»: *дзядуля мудрэйшы за ўнука; дзень даўжэйшы, чым ноч.*



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**Складаная форма вышэйшай ступені параўнання** прыметнікаў утвараецца шляхам спалучэння прыметнікаў са словамі ***больш (болей), менш (меней)***: *сучасны — больш сучасны, чым ... ; самастойны — больш самастойны за ... .* Калі параўноўваецца прымета прадмета з яго папярэднім станам, то прыназоўнік ***за*** не ўжываецца: *я стаў весялейшым* ці *больш вясёлым*.

Спалучэнні слоў ***вельмі, надта*** з прыметнікам не з'яўляюцца формамі ступеней параўнання: *вельмі мокры, надта халодны*.

**280.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму.

### Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь

Свята Дзень абаронцаў Айчыны «маладзейшае» за многія іншыя, што адзначаюць у нашай краіне. Але яно мае векавую гісторыю, цікавейшую, чым многія захапляльныя апавяданні.

Гэта свята — сімвал вернасці воінскаму абавязку і любові да Радзімы. Яно нагадвае нам пра мужнасць[м] тых, для каго незалежнасць роднай зямлі была важнейшай за ўласнае жыццё.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны 23 лютага віншавалі ўдзельнікаў вайны і тых, хто абараняў Радзіму ў мірны час.

Пазней з Днём абаронцаў Айчыны пачалі віншаваць му..чын розных пр..фесій і ўзростаў. Таму што любáя праца на карысць роднай краіны — абарона яе інт..рэсаў. Акрамя таго, кожны му..чына — абаронца сваёй с..м'і, якая для кожнага ч..лавека даражэйшая за любы́я бага..і.

Мы ганарымся нашымі абаронцамі, якія ахоўваюць мір і спакойны сон беларусаў *(Паводле В. Ванінай)*.

Знайдзіце ў тэксце прыметнікі ў форме вышэйшай ступені параўнання. Вызначце, як яны ўтварыліся. Абазначце асновы і суфіксы.

Выкарыстоўваючы формы ступеней параўнання з тэксту, складзіце сказы з выразамі *маладзейшы, чым ..., цікавейшы за ..., важнейшы, чым ...* .

Спішыце перадапошні абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары.

Падрыхтуйце насценную газету (у парах, групах) з віншаваннямі, фотаздымкамі татаў, дзядуляў.

**281.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Аднойчы дзядзька[ф] русы
Спаткаўся ў полі нам:
Тырчаць угору вусы
*(Доўгі)*, чым сам.
*Н. Гілевіч.*



У якой форме ўжыты ў тэксце прыметнік *доўгі*? Як яна ўтварылася?

**282.** Разгледзьце малюнкі. Параўнайце прыметы прадметаў. Выкарыстоўвайце простыя і складаныя формы вышэйшай ступені параўнання.






Для даведкі: *вялікі, малады, сумны, малы, нізкі, стары, высокі, вясёлы.*

Складзіце і запішыце два сказы з формамі вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў. Пакажыце графічна, як яны ўтварыліся.

!

**Простая форма найвышэйшай ступені параўнання** прыметнікаў утвараецца ад простай формы вышэйшай ступені пры дапамозе прыстаўкі ***най-***: *малы — меншы — **най**меншы, вялікі — большы — **най**большы.*

**Складаная форма найвышэйшай ступені параўнання** прыметнікаў утвараецца шляхам далучэння слова ***самы (самая, самае, самыя)*** ці ***найбольш, найменш*** да пачатковай формы якаснага прыметніка: *самы малы, самы вядомы; найбольш любімы, найменш цёплы.*

Формы найвышэйшай ступені параўнання могуць ужывацца з прыназоўнікамі ***з*** і ***сярод***: *найсмялейшы з нас, самы смелы сярод хлопцаў.*



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

Прыметнік ***малодшы*** ўжываецца ў значэнні ‘больш позні паводле часу свайго з’яўлення’: *малодшая сястра, малодшае пакаленне*. У якасці антоніма да слова *малодшы* ўжываецца прыметнік ***старэйшы***: *Збудаваў старэйшы брат мне драўляны самакат* (М. Мятліцкі).

Такія прыметнікі не з’яўляюцца формай ступені параўнання.

**283.** «Рашыце» моўныя задачы. Утварыце прапушчаныя формы ступеней параўнання. Прапорцыі запішыце, абазначце суфіксы прыметнікаў.

У з о р. *Ціхі: ? = ?: даўжэйшы — ціхі: цішэйшы = доўгі: даўжэйшы.*

1. Высокі: ? = ?: мацнейшы.
2. Дрэнны: ? = ?: лепшы.
3. Светлы: ? = ?: самы цёмны.
4. Далёкі: ? = ?: найшырэйшы.
5. Дакладны: ? = ?: больш вузкі.
6. Прыгожы: ? = ?: найменш смелы.

У рускай мове для таго, каб перадаць гранічную ступень якасці, ужываецца форма, утвораная пры дапамозе суфіксаў ***-айш-***, ***-ейш-***: *глубочайшее озеро, древнейший костёл*.

Для беларускай мовы ў такіх выпадках характэрна форма найвышэйшай ступені параўнання: *найглыбейшае возера, найстаражытнейшы касцёл*.

**284.** Прачытайце інфармацыю пра старажытныя гарады Беларусі.

**СТАРАЖЫТНЫЯ ГАРАДЫ БЕЛАРУСІ**

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Полацк | 862 г. | 6 | Брэст | 1019 г. | 11 | Лагойск | 1078 г. |
| 2 | Віцебск | 974 г. | 7 | Навагрудак | 1044 г. | 12 | Пінск | 1097 г. |
| 3 | Тураў | 980 г. | 8 | Браслаў | 1065 г. | 13 | Давыд-Гарадок | 1100 г. |
| 4 | Заслаўе | 985 г. | 9 | Мінск | 1067 г. | 14 | Барысаў | 1102 г. |
| 5 | Ваўкавыск | 1005 г. | 10 | Орша | 1067 г. | 15 | Слуцк | 1116 г. |

Параўнайце беларускія гарады, выкарыстоўваючы выразы: *найстаражытнейшы ..., самы старажытны ..., маладзейшы за ..., старэйшы, чым ..., больш старажытны за ..., менш старажытны, чым ...* . Запішыце сказы.

Складзіце «Кнігу геаграфічных рэкордаў Беларусі»: запішыце некалькі сказаў пра «самыя-самыя».

**285.** Прачытайце тэкст, замяняючы пачатковую форму прыметніка формамі вышэйшай або найвышэйшай ступеней параўнання. Вызначце, да якога стылю адносіцца тэкст. Падбярыце да яго загаловак.



Прыгожы куточак на беразе спакойнай і п..ўнаводнай Бярэзіны аблюбавала пара леб..дзяў. Круглы го.. гэтыя г..нарлівыя белыя птахі жывуць на в..дасховішчы і чаруюць людзей сваёй н..звычайнай прыгажосцю. Глянеш на іх — і яшчэ *(мілы)* сэрцу становіцца родная прырода. Але *(вялікі)* радасць птушкі прыносяць дзецям.

У адзін год стаяла суровая зіма. Часам траскучыя маразы дасягалі сарака градусаў. Ноччу яны былі яшчэ *(вялікі)*. На вадасховішчы[сл], дзе зімавала пара лебедзяў, не замерзла толькі адна палонка*. Але яна з кожным днём станавілася ўсё *(малы)* і *(малы)*. Тады на дапамогу любімым лебедзям прыйшлі вучні мясцовай школы. Яны злавілі[с] птушак і прынеслі ў школу. Даглядалі іх усю зіму, а ранняй вясной выпусцілі на волю. Удзячныя людзям лебедзі так і засталіся ў родным куточку *(Паводле Я. Галубовіча)*.

Чаму лебедзі застаюцца зімаваць у родных мясцінах?

Разгледзьце фотаздымак. Складзіце на яго аснове два сказы з прыметнікамі ў форме вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання.

Запішыце першы абзац тэксту, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Вызначце род назоўніка *лебедзь*.

Вусна перакажыце тэкст.

**286.** Прачытайце выслоўі знакамітых людзей. Якой асноўнай думкай аб'яднаны ўсе выказванні?

1. Язык — лучший посредник для установления дружбы и согласия *(Э. Роттердамский)*. 2. Язык — самое опасное оружие *(Педро де ла Барка)*. 3. Язык — это оружие литератора... Чем



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

лучше оружие — тем сильнее воин *(М. Горький)*. 4. Величайшее богатство народа — его язык *(М. Шолохов)*.

Перакладзіце сказы на беларускую мову, запішыце.

Растлумачце, як утварыліся формы вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання прыметнікаў. Вызначце іх склон, лік і род.

**287.** Спішыце прыказкі, замяняючы словы ў дужках формамі вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання.

1. Ад добрага чалавека вада *(дарагая)*, чым мёд ад кепскага. 2. Дрэнны мір *(добры)* за добрую сварку. 3. Любоў і праўда *(моцны)* за страх. 4. Ён смелы[м] толькі перад *(слабы)* за сябе. 5. Добры, шчыры сябар — *(вялікі)* багацце.

## § 46. Скланенне якасных і адносных прыметнікаў у адзіночным ліку

**288.** Прачытайце тэкст. Чаму ён так называецца?

**Ружовы верш**

Ружовы фламінга[м] ў ружовай вадзе
Ружовае пер'е перабірае.
У небе ружовым чароды аблок
Ружовае сонца пераганяе.

Выпішыце з тэксту словазлучэнні «прыметнік + назоўнік». Вызначце род, лік, склон прыметнікаў. Абазначце канчаткі.

**289.** Прачытайце табліцу. Дайце ёй назву.

| Склон | Мужчынскі род | | Ніякі род | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | *мал**ы** хлопчык*<br>*сух**і** палын* | *гарач**ы** хлеб*<br>*вячэрн**і** змрок* | *мал**ое** дзіця*<br>*сух**ое** лісце* | *гарач**ае** полымя*<br>*вячэрн**яе** неба* |
| Р. | ***-ага, -ога, -яга*** | | | |
| Д. | ***-аму, -ому, -яму*** | | | |
| В. | як **Н.** ці **Р.** | | як **Н.** | |
| Т. | ***-ым, -ім*** | | | |
| М. | ***-ым, -ім*** | | | |

Вусна праскланяйце словазлучэнні. Параўнайце канчаткі прыметнікаў.